***1 лютага 2024 года*** ў групе падоўжанага дня 1 "В" класа (выхавацель Казачэнка І.В.) прайшла цікавая прагулка-гульня "Мы едзем на цягніку".

У госці да дзяцей завіталі Васілёк і Васілінка. Усе разам адправіліся ў займальнае падарожжа па гарадах Беларусі, дзе дзяцей чакалі прыпынкі: Перакладаем, Тлумачым, Ужываем, Прымяняем. Дзеці адказвалі на пытанні, разважалі, выконвалі творчыя заданні. Пабывалі каля помніка літары Ў.

Гульня садзейнічала актывізацыі цікавасці да беларускай мовы, дазволіла ўвесці рускамоўных дзяцей у атмасферу жывога беларускага слова, дазволіла далучыць да багацця роднай мовы, адчуць яе прыгажосць, мелодыку.







